— Я дзе́сьці ба́чыў яго. Гэ́та хто такі́?
— Пазнаёмцеся!

Лад мовы

Предложение

Сказ

Предложение (сказ) — мысль, оформленная словами и высказанная с определённой интонацией.

В зависимости от того, что и зачем высказывается, предложения бываюту:
— *повествовательные (апавяда́льныя)*: **Я тут жыву́. Я му́шу ве́даць ва́шу мову.**
— *вопросительные (пыта́льныя)*: **Што ты пакі́неш у спа́дчыну ўну́кам сваі́м?**
— *побудительные (пабуджа́льныя)*: **Жыве́ Белару́сь!**

Слова-предложения выражают законченную мысль одним словом: **Так. Ага́. Пэ́ўна ж. Але́. Не.**

Частицы

Часьцінкі

Частица (часьці́нка) — служебная часть речи, придающая речи смысловые и эмоциональные оттенки.

Примеры частиц:

Указа́льныя	**гэ́та** (это), **вунь** (вон), **вось** (вот)
Удакладня́льныя	**якра́з** (как раз), **ама́ль** (почти), **менаві́та** (именно)
Абмежава́льныя	**толькі** (только), **хоць** (хоть, хотя), **хіба́** (разве)
Сьцьвярджа́льныя	**так** (да), **ага́** (да), **але́** (да)
Адмоўныя	**не** (нет), **ні** (ни), **а́ні** (ни)
Пабуджа́льныя	**хай** (пусть, пускай), **няха́й** (пусть, пускай), **ну** (ну)
Узмацня́льныя	**аж** (аж), **ду́жа** (сильно, очень), **на́дта** (очень), **на́ват** (даже), **дык** (так, вот, поэтому), **ж (жа)** (же)
Пыта́льныя	**га?** (что? а?) **хіба́?** (разве?) **ці?** (ли?) **няўжо?** (неужели?)
Клі́чныя	**вось дык!** (вот так!) **во як!** (вот как!) **што за!** (что за!) **ну і!** (ну и!) **як!** (как!) **які́я!** (какие!)

Частица ***а́ні*** используется для усиления отрицания: **мы прайшлі́ па вёсцы — не сустрэ́лі а́ні душы́** (мы прошли по деревне — не встретили ни души).

Па-беларуску кажуць так



— Можна, я ад цябе/ патэлефану/ю?
— Чаму/ ж не? Вось ту/така тэлефон, калі/ ла/ска, звані/!

— Добры дзень. Гэ/та кватэ/ра Вожыкаў?
— Добры дзень. На жаль, вы памылі/ліся, гэ/та кватэ/ра Сьцяпа/навых.
— Праба/чце… Няўжо я набра/ла ня той ну/мар? Паспрабу/ю зноў …
— Слу/хаю.
— Добры дзень. Гэ/та кватэ/ра Вожыкаў?
— Добры дзень. Так, так, кватэ/ра Вожыкаў.
— Запрасі/це, калі/ ла/ска, Ві/ктара Дзям'я/навіча.
— Яго няма/, ён яшчэ/ на пра/цы.
— А вы ня ве/даеце, калі/ ён бу/дзе?
— Патэлефану/йце, калі/ ла/ска, а сёмай гадзі/не.
— Дзя/кую. Быва/йце.
— Быва/йце.

— Гэ/та я!
— А! Ка/ся! Прывіта/ньне!
— Мне патрэ/бны Андрэ/й. Ён ча/сам не ў цябе/?
— Ма/е быць. Ды во заба/віўся не/дзе. За/раз пады/дзе.
— Калі/ пры/йдзе — перада/й, каб адра/зу ж патэлефанава/ў мне. Ён мне на/дта патрэ/бны.
— Добра, абавязкова перада/м.

— Чака/ем ужо пятна/ццаць хвілі/наў, а Зьмітра/ ўсё няма/! Ну дзе ж ён блука/е?
— Глядзі/, пад'яжджа/е тралей/бус… А вось і Зьмі/цер!
— Здаровы, хлопцы! Му/сіць, даўно чака/еце мяне/? Выбача/йце, я затрыма/ўся на пра/цы.
— Добра, што пасьпе/ў. Яшчэ/ ма/ем хвілі/наў колькі.
— Хіба/ зайсьці/ ў кавя/рню?
— Не, на кавя/рню ча/су ўжо няма/. Канцэ/рт пачына/ецца праз два/ццаць хвілі/наў.
— Ну, тады/ пойдзем хутчэ/й.

— Ну як?! Якое ўра/жаньне ад спэкта/клю?
— Найле/пшае.
— І мне такса/ма спадаба/лася. А што за арты/сты!
— І я проста ў захапле/ньні!
— Добра, што мы нарэ/шце нава/жыліся пайсьці/ ў тэа/тар.
— Які/ прые/мны ве/чар!

— Можа пройдземся?

— Добра. Заадно праведзяце/ мяне/ да гатэ/лю.

— Дава/йце пойдзем праз Трае/цкае прыме/сьце, уздоўж Сьві/слачы. Я там ве/даю адзі/н такі/ куточак, дзе можна прые/мна пасядзе/ць.

— Згодна, толькі ў дзе/сяць гадзі/наў я му/шу быць пры тэлефоне. Бу/дуць тэлефанава/ць з дому.

— Алё?

— Алё! Віта/ньне.

— Паўлі/на?! Прывіта/ньне! Ці ты ўжо ў горадзе?

— Тут. І Маце/й са мной.

— Во як добра! Нарэ/шце пазнаёміш мяне/ з сваі/м му/жам. Дзе ж вы спынілі/ся?

— У сваякоў на Нямі/зе. А што ў вас чува/ць?

— Шмат ціка/вага! Былі/ на адпачы/нку ў Фра/нцыі, толькі вярну/ліся. Ура/жаньняў поўна, але/ гэ/та пры сустрэ/чы. Калі/ спатка/емся?

— Ты ве/даеш, сёньня нія/к не выпада/е. Дава/й, можа, за/ўтра?

— Добра. А якой гадзі/не бу/дзеце ў мяне/?

— Бу/дзем не/дзе а палове на пя/тую.

— Ну, дык я вас чака/ю.

— Што ў вас ёсьцека з напояў?

— Ка/ва, гарба/та, жураві/навы морс, пі/ва, сталовае віно.

— Можа, узя/ць па ке/ліху бе/лага віна/?

— Як сабе/ хочаце. Я дык вазьму/ гарба/ту. А ці ёсьць зь зёлкамі?

— Ёсьць. Зёлкі такі/я: сьвятая/ньнік, чабор, суні/чны ліст ды яшчэ/ й шыпшы/на.

— Ве/льмі добра. Калі/ ла/ска, ку/бачак гарба/ты.

— А нам дзьве ка/вы зь вяршка/мі ды піражкі/ «Сяброўскія»… тры.

Практыкуйцеся

1. Сьцьвярджальныя сказы замяніце на адмоўныя (Утвердительные предложения замените отрицательными).

Узор: Усе/ пае/халі на экску/рсію. → Ніхто не пае/хаў на экску/рсію.

Усе/ чака/лі ягонага прые/зду.
Усе/ пра не/шта пыта/юцца.
Усі/м пасла/лі запрашэ/ньні.
Усі/м трэ/ба браць квіткі/.
Усе/ хочуць е/хаць.
Я зьбіра/юся е/хаць хоць куды/!
Мы пае/дзем дадому цягніком.
Дзе/ці пойдуць з на/мі ў тэа/тар.
Штове/чар ходзім на шпа/цыр.

Яны/ сёньня не/кага сустрака/юць.
Ён не/чым нам можа паспрыя/ць.
Усе/ ме/сцы — вольныя.
Ула/дзю, паста/ў ку/бак на стол!
Заходзьце сюды/!
Тут я й сам дам ра/ды!

2. Што будзеце рабіць? (Что будете делать?)

Ваш суразмоўца абура/е вас.	1. Вы/кажу свой пратэ/ст словамі: «Даволі!» альбо «Ну, гэ/та ўжо зана/дта!» 2. Усё ўзва/жу, перш чым спрача/цца. 3. Бу/ду намага/цца стрыма/ць сябе/. 4. Коратка й я/сна вы/кажу сваю/ ду/мку, пастара/юся прыве/сьці перакана/ўчыя аргумэ/нты. 5. Бра/зну дзьвяры/ма.
Не/хта звоніць у дзьве/ры.	1. Ніколі не адчыня/ю дзьве/ры, паку/ль не папыта/юся: «Хто там?» 2. Перш чым адчыня/ць, пагляджу/ ў дзьвярное вочка. 3. Адчыню/, скажу/: «Заходзьце, калі/ ла/ска», бо ве/даю, хто гэ/та. 4. Адра/зу адчыню/ дзьве/ры, бо ня ма/ю звы/чкі пыта/цца і глядзе/ць у дзьвярное вочка.
У пакоі на/дта холадна.	1. Уключу/ абагрэ/ўнік. 2. Спыта/юся ў ЖЭСе пра тэмпэрату/ру ў пакоях. 3. Вазьму/ гара/чы душ альбо ва/нну. 4. Бу/ду варушы/цца, каб ня зьме/рзнуць.

3. Пабудуйце сказы з ужываньнем наступных слоў, часьцінак ды словазлучэньняў (Составьте предложения, используя следующие слова, частицы и словосочетания).

Вось ён, няўжо ты згадзі/ўся, аж да ве/чару, хай пачака/е, ці гэ/та, як жа, досыць, як бы/ццам бы неблагі/, ні/бы я ня ве/даю.

4. Папытайцеся па-беларуску (Спросите по-белорусски).

Ты закончишь работу к воскресенью?
Куда ты направился?
Где мы сейчас находимся?
В какой стороне находится автовокзал?
Собраны ли все вещи?
Подождёшь меня на углу площади?
Придёшь к нам сегодня на ужин?
Пойдём завтра на прогулку в Верхний город?
Выберешь что-нибудь почитать из новых книг?
Наденешь на встречу новую шляпу?
Едите вы дома такой салат?
Купили ли вы яблок?
Чья это машина стоит во дворе?
Кто будет ухаживать за больным, пока вас нет?
Когда Алесь женился на Ольге?

5. Прачытайце і перакажыце тэкст.

Нам не сядзі/цца на ме/сцы. У сьвя/та мы зноў вы/браліся ў вандроўку. Е/дзем усе/ ўсемяры/х на роварах. Дарога — лясна/я, але/ скрозь чы/стая. Дзе-нідзе/ — пад гару/.

Празь яку/ю гадзі/ну мы ўжо ў Дубка/х. Трохі здарожыліся. За/раз жа дастае/м свае/ паку/нкі зь е/жай і ладку/емся сьне/даць. Я перш-на/перш пачына/ю кроіць хлеб. Сьпяша/емся, бо ўжо ўсі/м захаце/лася е/сьці.

— Я/дзя! Толік! Не раскіда/йце шкарлупі/ньня! Навошта бру/дзіць лес?! Мы сюды/ яшчэ/ ве/рнемся.

— Зьмі/тра, паглядзі/, калі/ ла/ска, у маёй су/мачцы касьцяну/ю лы/жачку — мне тра/пілася я/йка ўсьмя/тку.

— Грамада/, а ў мяне/ ёсьць бу/льба ў мундзіра/х — яе/ трэ/ба абабра/ць.

— Хто бу/дзе піць ка/ву? Яна/ трохі асты/лая, але/ ж усё роўна сма/чная.

Пасьля/ сьняда/ньня адпачыва/ем. Е/хаць ніку/ды ня хочацца. Сядзі/м, размаўля/ем:

— Чым ня ўту/льна мы ўладкава/ліся?

— Добра, але/ каб ня гэ/тыя грымлі/выя дына/мікі!

— Вяскоўцы забаўля/юцца, хто як можа.

— А мне бы толькі птушы/ны сьпеў…

— Ну, салоўку ты пад ве/чар яшчэ/ наслу/хаешся.

— Суце/шуся гэ/тым прыгожым спадзява/ньнем…

6. Якое пытаньне папярэднічала адказу? (Какой вопрос предшествовал ответу?)

… ? Е/дзем усемяры/х на роварах.
… ? Прые/халі ў Дубкі/.
… ? Сьпярша/ пачына/ю кроіць хлеб.
… ? Шкарлупі/ньня не раскіда/ем, бо сюды/ яшчэ/ ве/рнемся.
… ? Бу/льбу трэ/ба абабра/ць.
… ? Ка/ва трохі асты/лая.
… ? Не, е/хаць ня хочацца.
… ? Вяскоўцы забаўля/юцца.
… ? Яшчэ/ наслу/хаешся.

7. Замест кропак устаўце ў тэкст прапушчаныя словы.

Біле/т … дому я ўзяў туды й … . Цягні/к … у 11 гадзі/наў. Цяпе/р на маі/м … роўна 10. Зна/чыць, застае/цца яшчэ/ добрая … . Трэ/ба здаць рэ/чы на … і прайсьці/ся па бліжэ/йшых … . Хачу/ купі/ць дзе/цям … з ласу/нкаў. Та/нінай дачцэ/, … ме/ншай маёй пляме/ньніцы Ната/льцы, асаблі/ва … ме/нскія цуке/ркі. Куплю/, калі/ … . Якра/з па … тра/пілася кра/ма з прыва/бнаю … «Госьціца». Хіба/ … сюды/? Ту/така … ты/я … .

Ясь распавядае



У мяне́ гасьцю́е адзі́н мой знаёмец з Баўга́рыі. Сёньня мне заману́лася прайсьці́ся зь ім па ву́лках Трае́цкага прыме́сьця. Урэ́шце натра́пілі на рэстара́цыю «Мядзьве́дзь» пры Старой ву́ліцы. Гэ́та ве́льмі шанава́ная ўстанова. Ама́тары вы́піць і сма́чна пад'е́сьці горнуцца сюды́ дзе́ля прыстойнай белару́скай ку́хні. Тут табе́ і кру́пнік, і «кру́пнік іна́чай», і настойка з агрэ́сту — уся́кія ха́тнія тру́нкі й ква́сы. Што характэ́рна — усё белару́скае! І гу́тарка скрозь белару́ская.

…Нарэ́шце мы вы́бралі ўту́льны заку́так. Уладкава́ўшыся, узялі́ па ке́ліху чырвонага баўга́рскага віна́ і ка́чку ў руды́м соўсе. Пасядзе́лі, пагамані́лі. Мой госьць заўва́жыў між і́ншага, што белару́сы, віда́ць, — ве́льмі здольныя да моваў. Прызна́цца, я так ня ду́маў.

Пакі́нуўшы «Мядзьве́дзь», на Старой ву́ліцы мы спатка́лі Тамаша́. Ён, як заўсёды, штосьці здыма́ў. Тамаша́ я ўважа́ю за роўнага сабе́ ў майстэ́рстве фатаграфава́ньня.

— Як справу́нкі? — пыта́юся ў яго.

— Па сьвя́це е́дзем на Ўкраі́ну.

— На госьці?

— Ага, да крэ́ўных, у Бе́лую Царкву́.

— Кудой вы е́дзеце? Праз Кі́еў, га?

— Пэўна ж!

Падчас сёньняшняга на́шага шпацырава́ньня мой госьць не сумава́ў.

Практыкуйцеся

8. Прачытайце наступныя сказы. Скажыце «так» альбо «не», а потым патлумачце, чаму вы пагадзіліся альбо не.

У Я́ся гасьцю́е знаёмец з Польшчы.
Я́севага госьця зваць Тама́ш.
Яны́ ўчора хадзі́лі на шпа́цыр.
Яны́ пайшлі́ на шпа́цыр у Трае́цкае прыме́сьце.
Яны́ зайшлі́ ў рэстара́цыю «Мядзьве́дзь».
У рэстара́цыі не было вольных ме́сцаў.
У рэстара́цыі падаю́ць белару́скія стра́вы.
Яны́ ўзялі́ гусю́ зь я́блыкамі і па кілі́шку гарэ́лкі.
Яны́ былі́ ў рэстара́цыі аж да ве́чару.
Яны́ пілі́ баўга́рскае віно.
Ясь спатка́ў свайго ся́бра на праспэ́кце Францы́шка Скары́ны.
Я́сеў ся́бра — фатограф.
Ясь уважа́е свайго ся́бра роўным сабе́ ў майстэ́рстве фатаграфава́ньня.
Ясь па сьвя́це пае́дзе ва Ўкраі́ну.
Крэ́ўныя Тамаша́ жыву́ць у Кі́еве.
Тама́ш толькі што вярну́ўся зь Бе́лай Царквы́.
Тама́ш е́дзе па спра́вах.
Шпа́цыр прые́мна ўра́зіў госьця.

9. Прачытайце тэкст. Раскажыце, як вы хадзілі на госьці да сваякоў.

Сёньня нядзе́ля. Я палу́дную ў сям'і́ Пётры. Мне падаба́ецца і́хны прыгожы дом, чысьціня́, уту́льнасьць. І што ва́жна — дзе́ці не ўбаку́ ад бацькоў.

— Е́жце, дзе́ці, боршч.

— Ён заду́жа гара́чы.

— Ня дзьмі ў тале́рку. Е́сьці трэ́ба нячу́тна, і ня сёрбаць, бо гэ́та непрыгожа. А хто бацькоў ня слу́хае, той у па́льцы дзьму́хае.

На дэсэ́рт сёньня ма́ем вінагра́д. Цётка Фа́ня часту́е нас. Малы́ Ю́зя ве́дае, як даць ра́ды зь вінагра́дам.

Дзе́ці папалу́днавалі ды пабе́глі на ву́ліцу.

10. Перакладзіце на беларускую мову.

У нас сегодня свободный вечер, и я решил купить билеты в театр. «Какая прекрасная мысль, — сказала моя жена. — Я буду рада посмотреть хороший спектакль. Бери билеты лучше в середине, 9-11-й ряд, если можно».

Я так и сделал. Вечером к 7-ми часам мы пошли в Купаловский театр смотреть «Князя Витовта».

Поверьте, это было замечательно!.. Перенестись в XIV век, увидеть пышный цветок тех времён — Беларусь, тогда — Великое Княжество Литовское. Я испытал эстетическое удовольствие. Кроме того, лучше понял историю Беларуси.

«Князь Витовт», по-моему, — лучший спектакль, который я когда-либо видел. Все актёры играли замечательно. Особенно мне понравился исполнитель главной роли. Это действительно талантливый актёр. Советую вам непременно посмотреть «Князя Витовта».

Кароткія размовы
(чытайце ўголас)

— А хто гэ́на та́мака? — Дзе? — Вунь, у пле́ценым крэ́сьле. — Вось табе́ й ма́еш! Дык гэ́та ж дзя́дзька Антось! Ты што, не пазна́ў яго?	— А кто это там? — Где? — Вон там, в плетёном кресле. — Вот тебе и на! Так это же дядя Антон! Ты что, не узнал его?
— Усё, спыня́емся! — Кі́даем гуля́ць, ці што? — Чу́еш, нас клі́чуць на гарба́ту. — Добра. Але́ пасьля́ перапы́нку, будзь пэ́ўны, я цябе́ перамагу́. — Паглядзі́м… Дай Божа на́шаму ягня́тку ваўка́ зье́сьці.	— Всё, прекращаем! — Бросаем игру, что ли? — Слышишь, нас зовут к чаю. — Хорошо. Но после перерыва, будь уверен, я буду победителем. — Посмотрим… Не говори «гоп», пока не перепрыгнешь.
— Убра́лася, ні́бы князёўна. Куды́ ж гэ́та?	— Нарядилась, словно княжна. Куда это так?

— На дыскатэ/ку! Пойдзем ра/зам. — А каб жа ты мне ране/й сказа/ла! — Да дыскатэ/кі ма/ем яшчэ/ досыць ча/су. Проста мне карце/ла прыме/рыць свае/ абноўкі.	— На дискотеку! Пошли вместе. — Эх, если бы ты мне раньше сказала! — До дискотеки ещё достаточно времени. Просто мне не терпелось примерить свои обновки.
— Дзе ты гэ/так затрыма/лася? — Дык сёньня ж у школе быў бацькоўскі сход. — Ну, і што сказа/ла наста/ўніца пра на/шага Па/ўлу? — Ну, што. З мовамі ў яго нармалёва. А вось матэма/тыка… Наста/ўніца ка/жа, што тут трэ/ба яшчэ/ папрацава/ць. — А як паводзіны? — О-о-о, тут яго трэ/ба дукава/ць а дукава/ць. На перапы/нках лётае, не/слух гэ/ты. Ве/даеш, што было? Гэ/так ляце/ў, што ледзь ня зьбіў з ног дырэ/ктара школы. Наста/ўніца ме/ла вымову. — Ба/чыш, за гэ/тымі камандзіроўкамі дзіця/ зусі/м раздуры/лася.	— Где это ты так задержалась? — Так сегодня же в школе было родительское собрание. — Ну, и что сказала учительница про нашего Павла? — Ну, что. С языками у него нормально. А вот математика… Учительница говорит, что здесь нужно ещё поработать. — А как поведение? — О-о-о, тут его нужно воспитывать и воспитывать. На переменках носится, сорванец такой. Знаешь, что было? Так летел, что чуть не сбил с ног директора школы. Учительница получила выговор. — Видишь, за этими командировками ребёнок совсем отбился от рук.
— Ну, як там на/шыя гарадзе/нцы? — Зьве/стак ад іх няма/ а/ні зва/ньня. — Гэ/та ж трэ/ба! Паўгода як перае/халі, і дагэ/туль — ні адка/зу, ні прыка/зу.	— Ну, как там наши гродненцы? — От них нет никаких вестей. — Это ж надо! Полгода как переехали, и до сих пор — ни ответа, ни привета.
— Прывіта/ньне! — Здароў. Што чува/ць? — Учора ўве/чары Сумі/цкія прые/халі. — Няўжо ўсёй сям'ёю? — Усе/ пяцёра. — Вось дык навіна/! А ў каго яны спыні/ліся? — Паку/ль у І/ркі. А потым ма/юць наме/р пажы/ць і ў мяне/.	— Привет! — Здорово. Что слышно? — Вчера вечером Сумицкие приехали. — Неужто всей семьёй? — Все пятеро. — Вот так новость! А у кого они остановились? — Пока у Иры. А потом собираются пожить и у меня.
— Яка/я там сёньня пошта? — Прыйшлі/ газэ/ты ды ліст ад бабу/лі. — Кажы/ мацне/й! Я нічога ня чу/ю! — Пачака/й, пайду/ скажу/ Міхасю/, каб му/зыку цішэ/й зрабі/ў. Ужо ўвушшу/ зьвіні/ць, ра/ды няма/.	— Какая там сегодня почта? — Пришли газеты и письмо от бабушки. — Говори громче! Я ничего не слышу! — Подожди, пойду скажу Михаилу, чтобы музыку сделал потише. Уже в ушах звенит, сил нет.

Майстры слова гавораць

Ве/дама, што ча/ста бацькі/ даю/ць сваі/м дзе/цям такое выхава/ньне, каб яны/ былі/ кары/сныя ім, а не сабе/.

Вось дзе/ля такі/х бацькоў раскажу/ я ба/йку аднаго нябошчыка-белару/са.

Ляці/ць бу/сел па-над морам і нясе/ пад сваі/мі кры/льлямі трох бусьляня/т. Як ста/ла ця/жка не/сьці, дык ён пыта/е ў пе/ршага дзіця/ці: «Ці бу/дзеш ты мяне/ не/сьці, як я састарэ/юся?» Бусьляня/ спалохалася, каб ба/цька ня кі/нуў яго ў мора, дый ка/жа: «Бу/ду». Бу/сел кі/нуў яго ў мора.

Паляце/ў ён далёка з дву/ма бусьляня/тамі. Зноў ста/ла ця/жка. Пыта/е ён тады/ ў другога бусьляня/ці: «Як састарэ/юся я, ці ты бу/дзеш не/сьці мяне/ так са/ма, як я цябе/ нясу/?» — «Бу/ду!» — са стра/ху адказа/ла й другое бусьляня/. Бу/сел кі/нуў яго ў мора, бо й яно сказа/ла няпра/ўду.

Паляце/ў ён цяпе/р з апошнім дзі/цем. Пасярэ/дзіне мора ізноў ста/ла ця/жка не/сьці. Бу/сел пыта/е ў свайго трэ/цяга бусьляня/ці, ці бу/дзе яно не/сьці ба/цьку, як ён зробіцца стары/м. «Не, ня бу/ду, — адказа/ла бусьляня/, — бо тады/ я бу/ду мець свае/ дзе/ці, і мне трэ бу/дзе насі/ць іх».

Трэ/цяе бусьляня/ сказа/ла пра/ўду, і ба/цька перанёс яго це/раз мора.

Язэ/п Лёсік